

# Віншуем калегу!

10 чэрвеня 2011 г. святкавала свой юбілей дырэктар бібліятэкі ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт» БЫЦКАЯ Любоў Іванаўна. Яна працуе ў бібліятэцы УА «ВДТУ» амаль 30 гадоў, 19 з іх – дырэктарам.

Любоў Іванаўна – бібліятэкар па прызванні. Яна прысвяціла бібліятэцы і бібліятэчнай справе 40 гадоў і, нягледзячы ні на што, засталася вернай аднойчы і назаўсёды выбранаму шляху. Пра такіх кажуць: чалавек на сваім месцы. Яе ведаў, навыкаў, жыццёвага вопыту, прафесіянальнай упэўненасці ў сабе хапіла на тое, каб ў такі няпросты час, у складанай кадравай сітуацыі столькі гадоў не проста працаваць ў бібліятэцы, а быць на чале калектыву.

За час свайго дырэктарства Любоў Іванаўна многа зрабіла для бібліятэкі, якая стала яе домам, другой сям'ёй. Значна павялічылася плошча бібліятэкі, змянілася яе структура, у два разы вырас штат. Дзякуючы яе намаганням у бібліятэку прыйшло многа маладых супрацоўнікаў, якія з цягам часу з бібліятэкараў сталі сапраўднымі спецыялістамі.

Прызнаючы прыярытэт інфармацыйнай дзейнасці і новых тэхналогій, наш дырэктар у той жа час шукае шляхі пастаяннай мадыфікацыі структуры бібліятэкі: арганізацыі спецыялізаваных залаў абслугоўвання, развіцця маркетынгавага кірунку дзейнасці. Энергіі нашай Любові Іванаўны могуць пазайздросціць многія. Не ўсім жанчынам-кіраўнікам удаецца так спалучыць у сабе арганізатарскі талент, сілу характару, патрабавальнасць да сябе і да другіх з адказнасцю і клопатам пра людзей.

Шматгадовая і самаадданая дзейнасць, арганізатарскія здольнасці, прафесіяналізм, уменне сплаціць і павесці за сабой калектыў заслугоўваюць самай высокай адзнакі.

Мы праз наш адзіны прафесійны часопіс хочам падзякаваць нашаму дырэктару за яе адносіны да справы, добразычлівасць, неабыякавасць і павіншаваць з юбілеем.

*Калектыў бібліятэкі УА «ВДТУ»*